

# Сергей Николаевич ХОДИН

# Сяргей Мікалаевіч ХОДЗІН

# Siarhei Mikalaevich KHODZIN

Загадчык кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар С. М. Ходзін 31 мая адзначыў 60-гадовы юбілей. Больш за палову жыцця, 35 гадоў, ён прысвяціў БДУ.

Сяргей Мікалаевіч нарадзіўся ў пасёлку Путчына Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачых. Пасля выдатнага заканчэння ў 1980 г. Чырвонаслабодскай сярэдняй школы Салігорскага раёна Мінскай вобласці С. М. Ходзін паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на спецыяльнасць «гісторыя». Найбольшы ўплыў на фарміраванне будучага спецыяліста аказалі беларускія вучоныя К. А. Равяка, І. М. Ігнаценка, А. П. Ігнаценка, А. Л. Абэцэдарская (кіраўнік дыпломнай працы С. М. Ходзіна), І. В. Царук. Гэта былі аўтарытэтныя спецыялісты ў галіне сацыяльна-эканамічнай гісторыі, гісторыі непрывілеяваных саслоўяў і беларускага сялянства.

Гістарычны факультэт Сяргей Мікалаевіч скончыў з адзнакай у 1985 г. Першым месцам яго працы стала Дактаровіцкая сярэдняя школа Капыльскага раёна Мінскай вобласці, куды малады спецыяліст быў прызначаны дырэктарам (1985–1988). У 1986–1990 гг. С. М. Ходзін працягваў атрымліваць адукацыю ў аспірантуры БДУ на завочнай форме навучання, дзе пад навуковым кіраўніцтвам доктара гістарычных навук прафесара І. В. Царук даследаваў гісторыю беларускай вёскі ў 1920-я гг. У 1988 г. ён перайшоў на працу ў БДУ на кафедру гісторыі БССР. Малады выкладчык чытаў курс па гісторыі Беларусі XX ст. для студэнтаў завочнай формы навучання. У 1990 г. С. М. Ходзін абараніў кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці «айчынная гісторыя» на тэму «Калгаснае будаўніцтва ў Беларускай ССР у 1921 – першай палове 1929 г.».

У 1992 г. Сяргей Мікалаевіч атрымаў званне дацэнта. У маі 1994 г. ён перайшоў на кафедру гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, а ў верасні 1995 г. – на кафедру крыніцазнаўства і музеязнаўства.

Глыбокая крыніцазнаўчая падрыхтоўка С. М. Ходзіна патрабавала ад яго сістэматызацыі накопленых ведаў, далейшых навуковых даследаванняў, укаранення новых матэрыялаў, метадаў і форм у адукацыйны працэс. Яшчэ ў 1993 г. на 1-й Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў Сяргей Мікалаевіч прадставіў канцэпцыю развіцця крыніцазнаўства гісторыі Беларусі. Вынікі навуковых пошукаў знайшлі выражэнне ў распрацоўцы курса «Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі». У далейшым асабіста С. М. Ходзіным, а таксама ў суаўтарстве з іншымі спецыялістамі быў падрыхтаваны шэраг падручнікаў па гісторыі і тэорыі крыніцазнаўства, а таксама па крыніцазнаўству айчыннай гісторыі[1].

[1] *Ходзін С. М.* Крыніцы гісторыі Беларусі (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне) : [вучэб. дапам.]. Мінск : БДУ, 1999. 192 с. ; *Грицкевич В. П., Каун С. Б., Ходин С. Н.* Теория и история источниковедения : пособие для гуманит. фак. Минск : БГУ, 2000. 221 с. ; *Каун С. Б., Липницкая О. Л., Ходин С. Н.* Теория и история источниковедения : учеб.-метод. комплекс. Минск : БГУ, 2001. 81 с. ; *Грицкевич В. П., Каун С. Б., Ходин С. Н.* История и теория источниковедения : учеб. пособие. Минск : БГУ, 2008. 254 с. ; *Ходзін С. М.* Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі : дапаможнік. Мінск : БДУ, 2012. 255 с.

У 2000–2016 гг. С. М. Ходзін працаваў на пасадзе дэкана гістарычнага факультэта БДУ. У 2001–2017 гг. ён з’яўляўся таксама загадчыкам кафедры крыніцазнаўства (была створана ў выніку рэарганізацыі кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства ў два асобныя структурныя падраздзяленні).

У 2001 г. на базе кафедры крыніцазнаўства было створана аддзяленне дакументазнаўства, якое сёння ажыццяўляе падрыхтоўку студэнтаў па спецыяльнасцях «гісторыка-архівазнаўства» і «дакументазнаўства (па напрамках)», а таксама магістрантаў па спецыяльнасці «дакументазнаўства і архівазнаўства». Стварэнне новых спецыяльнасцей, распрацоўка новых вучэбных планаў і праграм, а фактычна выбудова новай структуры адукацыйнага працэсу на гістарычным факультэце праходзілі пры непасрэдным удзеле С. М. Ходзіна і згуртаваных вакол яго калег.

Дасягненні, прадэманстраваныя С. М. Ходзіным на пасадзе дэкана гістарычнага факультэта, адыгралі немалаважную ролю ва ўключэнні яго ў склад кіраўніцтва ўніверсітэтам. У 2016 г. ён быў прызначаны прарэктарам БДУ па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі і працаваў на гэтай пасадзе да 2018 г.

У 2017 г. Сяргей Мікалаевіч абараніў дысертацыю на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці «айчынная гісторыя» на тэму «Беларуская вёска: савецкая мадэрнізацыя ў 1921–1939 гг.»[2]. Навуковым кансультантам выступіў доктар гістарычных навук, прафесар П. І. Брыгадзін. Даследаванне стала важным укладам у вывучэнне праблем айчыннай гісторыі савецкага часу міжваеннага перыяду, а таксама ў распрацоўку тэмы мадэрнізацыі ў Беларусі, якая ў апошнія дзесяцігоддзі стала своеасаблівым навуковым профілем гістарычнага факультэта ўніверсітэта.

У 2019 г. С. М. Ходзін атрымаў званне прафесара. У тым жа годзе ён вярнуўся на кафедру крыніцазнаўства, заняўшы пасаду прафесара. З 2020 г. Сяргей Мікалаевіч працягвае сваю дзейнасць на пасадзе загадчыка кафедры. У 2022 г. гэтае структурнае падраздзяленне адзначыла 30-годдзе.

Пад навуковым кіраўніцтвам С. М. Ходзіна былі падрыхтаваны і абаронены пяць кандыдацкіх дысертацый. Амаль усе вучні Сяргея Мікалаевіча звязалі прафесійную дзейнасць з гістарычным факультэтам БДУ. Сёння яны фарміруюць склад навуковай школы прафесара, якая ўвасабляе сабой пераемнасць традыцый навуковай школы крыніцазнаўства, закладзенай яшчэ першым рэктарам БДУ У. І. Пічэтам[3].

Сфера навуковых інтарэсаў прафесара С. М. Ходзіна ахоплівае гісторыю беларускага сялянства[4], сацыяльную псіхалогію, этнасацыяльныя і дэмаграфічныя працэсы, тэорыю і гісторыю крыніцазнаўства, крыніцазнаўства гісторыі Беларусі, гісторыю Беларусі XX ст., гісторыю і тэорыю кіравання, эканамічныя паводзіны. Сяргей Мікалаевіч шматразова з’яўляўся кіраўніком і ўдзельнікам навукова-даследчых праектаў. Сярод іх праекты «Этнасацыяльная дынаміка грамадства на этапе рэфармавання (Беларусь у міжваенны час)» (2010), «Трансфармацыйныя працэсы і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства ў 1920–1930-я гг.: кампаратыўныя аспекты» (2020) і інш.

С. М. Ходзін з’яўляецца аўтарам каля 150 публікацый. У іх ліку манаграфіі, артыкулы, навучальныя дапаможнікі для вышэйшай школы, выданні для школьнікаў і абітурыентаў. Ён прымаў актыўны ўдзел у выданні гісторыка-дакументальных хронік «Памяць» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку, у розны час уваходзіў і працягвае ўваходзіць у склад рэдакцыйных калегій шэрагу навуковых часопісаў і зборнікаў.

Багаты арганізатарскі вопыт у галіне вышэйшай адукацыі, экспертны ўзровень ведаў дазволілі С. М. Ходзіну прымаць удзел у працы калегіяльных органаў у сферы адукацыі, навукі і культуры, у тым ліку рэспубліканскага ўзроўню. Так, у 2009–2017 гг. С. М. Ходзін кіраваў экспертнай групай Камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны абарот нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія аказаліся за межамі краіны.

Прафесар С. М. Ходзін вядомы ў навуковых колах і за межамі краіны. Ён праходзіў стажыроўкі ў Расійскім дзяржаўным гуманітарным універсітэце, Маскоўскім дзяржаўным універсітэце, Універсітэце Кента (Вялікабрытанія) і інш. За шматгадовую навуковую і педагагічную дзейнасць, уклад у распрацоўку і рэалізацыю канцэпцыі бесперапыннай адукацыі ў галіне гістарычных навук, стварэнне канцэпцыі

[2]*Ходзін С. М.* Беларуская вёска: савецкая мадэрнізацыя ў 1921–1939 гг. : дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.02. Мінск : БДУ, 2016. 349 с.

[3]*Ходзін С. М.* Традыцыі і перспектывы развіцця крыніцазнаўства ў Беларускім дзяржаўным універсітэце // Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX–XXI ст. у Беларусі : зб. навук. арт., прысвеч. 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал.: С. М. Ходзін [і інш.]. Мінск : БДУ, 2008. С. 167–171 ; *Ходзін С. М., Шумейка М. Ф., Яноўскі А. А.* Памяць і слава: першы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – Уладзімір Іванавіч Пічэта. Мінск : БДУ, 2011. 375 с. ; *Ходин С. Н., Шумейко М. Ф.* Продолжая традиции: кафедре источниковедения Белорусского государственного университета – 20 лет // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Мінск : БДУ, 2012. Вып. 7. С. 3–10.

[4]*Ходзін С. М.* Беларуская вёска: савецкая мадэрнізацыя ў 1921–1939 гг. … ; *Ён жа.* Беларуская вёска ў міжваенны час: шляхі і формы савецкай мадэрнізацыі (1921–1939). Мінск : БДУ, 2014. 240 с. ; *Ён жа.* Мадэрнізацыя ў Беларусі (1921–1939). Мінск : БДУ, 2019. 287 с.

развіцця крыніцазнаўства гісторыі Беларусі, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ўніверсітэта і факультэта і іншыя дасягненні С. М. Ходзін адзначаны шэрагам узнагарод.

Высокія прафесійныя якасці, сумленнасць, добразычлівасць, адкрытасць, уважлівасць да людзей абумовілі глыбокую павагу да Сяргея Мікалаевіча з боку ўсіх, хто з ім працуе. Калектыў кафедры крыніцазнаўства БДУ, кіраўніцтва, калегі і студэнты гістарычнага факультэта шчыра віншуюць юбіляра з днём нараджэння, жадаюць яму моцнага здароўя, дабрабыту, поспехаў у працы і новых навуковых здзяйсненняў.

***А. М. Бяляўскі*[5]*, А. М. Латушкін*[6]*,***
***М. Ф. Шумейка*[7]**

[5]*Александр Михайлович Белявский* – кандидат исторических наук; доцент кафедры источниковедения исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Аляксандр Міхайлавіч Бяляўскі* – кандыдат гістарычных навук; дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Aliaksandr M. Bialiauski*, PhD (history); associate professor at the department of source study, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *bialiauski@bsu.by*

[6]*Андрей Николаевич Латушкин* – кандидат исторических наук; доцент кафедры источниковедения исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Андрэй Мікалаевіч Латушкін* – кандыдат гістарычных навук; дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Andrei M. Latushkin*, PhD (history); associate professor at the department of source study, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *latushkin@bsu.by*

[7]*Михаил Фёдорович Шумейко* – кандидат исторических наук; профессор кафедры источниковедения исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Міхаіл Фёдаравіч Шумейка* – кандыдат гістарычных навук; прафесар кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Mihail F. Shumeika*, PhD (history); professor at the department of source study, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *shumf@bsu.by*